# Пачатак і заканчэнне Другой сусветнай вайны

## Беларусь, 1944

Урок
90 хвілін

Дадатковы
матэрыял

Дзённікі /
Успаміны

# Дзённікі / Успаміны

# 3 ліпеня 1944 г.: Успаміны пра Дзень вызвалення Мінска

3 ліпеня 2020 г.

**Віншуем з гадавінай вызвалення Мінска!**

**Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна ў Мінску** віншуе ўсіх з гадавінай вызвалення Мінска ад нацыстаў! Немагчыма пераацаніць важнасць гэтай даты для ўсіх нас. Асабліва для тых, хто выжываў у цяжкія гады акупацыі Беларусі, стаў вязнем гета і канцлагераў. Дзень 3 ліпеня 1944 года стаў паваротным у вызначэнні будучыні нашай краіны. Як казалі сведкі: «Толькі тады пачалося жыццё».

Каб лепш зразумець, што яны адчувалі, прапануем звярнуцца да двух прыкладаў з гісторыі Мінскага гета і лагера смерці Малы Трасцянец.



Дзякуючы вызваленню Мінска змаглі выратавацца апошнія вязні гета, якія хаваліся ў «маліне» (таемнае падземнае сховішча, схрон) паўразбуранага дома на вуліцы Сухой на той момант ужо 9 месяцаў. З 26 чалавек выжылі 13. Калі іх знайшлі, толькі адзін мог рухацца сам. **Сямён Добін** узгадваў, што «ў апошнія два месяцы ў большасці ўжо не было сіл уздымацца з нараў». Яны сышлі пад зямлю, хаваючыся ад смерці, яшчэ да ліквідацыі Мінскага гета ў кастрычніку 1943 года, і толькі пасля вызвалення горада савецкімі войскамі 3 ліпеня 1944 года ім удалося атрымаць неабходную медыцынскую дапамогу і вярнуць веру ў далейшую будучыню.



Сыходзячы, немцы хавалі сляды сваіх злачынстваў, забівалі тых, хто яшчэ заставаўся ў іх месцах прымусовага зняволення. Цудам пазбег смерці ў хляве ў Малым Трасцянцы **Мікалай Валахановіч**, які быў арыштаваны службай бяспекі СД за сувязь з партызанамі. У ходзе расстрэлу 29 чэрвеня ён страціў адно вока, але цудам выжыў, прыкінуўшыся мёртвым, аднак апынуўся пад гарой трупаў. Мікалай пачуў размову аб планах спаліць хлеў, дзе быў расстрэл. Яму ўдалося выбрацца незаўважаным, пакуль расстрэльная каманда займалася новапрыбылай машынай, і дабрацца да самага блізкага поля жыта. Там ён страціў прытомнасць і ачуняў ужо тады, калі хлеў гарэў. На наступны дзень ён пакінуў тэрыторыю лагера, зайшоў у бліжэйшую вёску, дзе яму аказалі медыцынскую дапамогу, накармілі і пераапранулі. Вызваленне Мінска стала выратавальным для яго. Пазней ён дапамагаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні злачынстваў нацызму ў абследаванні хлява з абгарэлымі трупамі – аднымі з апошніх ахвяр нацыстаў у Мінску.

324 словы

Крыніца: http://gwminsk.com/pozdravlyaem-s-godovshchinoy-osvobozhdeniya-minska-3-iyulya-1944-goda-1